**БЕЛАРУСКАЯ СТУДЭНЦКАЯ ЮРЫДЫЧНАЯ АЛІМПІЯДА - 2009**
**індывідуальны залік**
**складанне праекта правапрымяняльнага акта**

Іваноў – рамеснік, разьбяр па дрэву – у заяве на імя Старшыні Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь пазначыў, што пры скасаванні шлюбу пакінуў жонцы трохпакаевую кватэру ў Мінску для “выхавання дзвюх малых дзетак”. Узамен жонка абяцала не спаганяць аліменты, бо Іваноў планаваў перадаваць трэць ад свайго заробка добраахвотна. Гэтая дамова выконвалася бакамі, але праз два гады былая жонка, якая мела фінансавыя праблемы з прычыны хваробы свайго мужа, падала ў суд на спагнанне аліментаў, адначасова прадаўшы кватэру, якую её пакінуў Іваноў.

Згодна выканаўчага ліста з Іванова спаганяецца значная сума па аліментах, на якую ідзе ўвесь яго прыбытак ад разьбярства па дрэву. Паслугі не карыстаюцца вялікім попытам, але Іваноў не бачыць сэнсу брацца за іх, бо ўвесь прыбытак ідзе на аліменты. На момант падачы заявы Іваноў мае запазычанасць як па аліментах, так і па камунальных плацяжах, а судовы выканаўца папярэдзіў аб пачатку па заяве былой жонкі працэса продажу яго бацькоўскага дома ў весцы, дзе знаходзіцца майстэрня.

Складзіце праект адказу.

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com